УДК 821.161.3-4

# ЭСЭ А. АНДРЭЕВА “ВЫ ЎСЁ Ж ТАКІ ХАЦЕЛІ Б СТАЦЬ ПІСЬМЕННІКАМ?”

**Бажок Ірына Аляксандраўна**
асістэнт кафедры беларускай літаратуры ўстановы адукацыі “Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны”
(г. Гомель, Беларусь)

*Ключавыя словы: эсэ, аўтар, чытач, суб’ектыўнасць, доказная сістэма.*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Артыкул прысвечаны асэнсаванню аднаго з самых значных эсэ А. Андрэева “Вы ўсё ж такі хацелі б стаць пісьменнікам?”. Сцвярджаецца самарэфлексійны характар твора, разглядаюцца аўтарскія стратэгіі ў доказнай сістэме твора, выяўляецца жанравая прыналежнасць твора.*

Літаратурная самарэфлексія, непасрэднае асэнсаванне мастацтвам слова “уласнай прыроды і прызначэння, акцэнтацыя ўвагі творцаў на самім працэсе творчасці з’яўляюцца вызначальнымі рысамі сучаснага мастацкага развіцця” [2, с. 129]. Да асэнсавання літаратурнай творчасці (для чаго і для каго неабходна пісаць) звяртаўся знакаміты французскі пісьменнік Жан Поль Сартр у эсэ “Што такое літаратура?” (1945 г.).

Мэтанакіраваны зварот да эсэ як жанру з вялікімі магчымасцямі характэрны для літаратуры апошніх дзесяцігоддзяў. Узорам жанру ў сучасным прыгожым пісьменстве трэба назваць філасофскае эсэ А. Андрэева “Вы ўсё ж такі хацелі б стаць пісьменнікам?” (“Вы всё ещё хотите стать писателем?), 2016 г. Аўтар ставіць перад сабой мэту “изложить своё видение писательства как культурного феномена, как тип жизнетворчества – изложить и оформить как «послание молодым», внятно и системно” [1, с. 167]. Увесь тэкст і ёсць адказ на пастаўленае ў назве пытанне. Аднак форма адказу – не літаратуразнаўчы артыкул, а эсэ. Дзякуючы свайму прафесіяналізму пісьменнік прадстаўляе ўзорны тэкст, які сам па сабе з’яўляецца прыкладам мастацкага твора, пра стварэнне якога піша А. Андрэеў.

Даследаванне гісторыі эсэістыкі дазваляе зрабіць выснову адносна таго, што пісьменнікі, якія пішуць моцныя, знакавыя эсэ, валодаюць высокім інтэлектам і сапраўдным талентам (І. Канчэўскі, У Самойла, У Жылка, А. Бабарэка). Ю. Лотман быў упэўнены ў тым, што сакрэт чытацкай цікаўнасці да аўтара знаходзіцца ў “псіхалагічнай структуры” [4, с. 230] яго асобы. А. Андрэеў – чалавек інтэлектуальнай працы, доктар навук, і да таго ж – пісьменнік з вялікім літаратурным вопытам.

Тэкст “Вы ўсё ж такі хацелі б стаць пісьменнікам?” складаецца з пяці частак, у кожнай з якіх ёсць свая мікратэма: тэхніка стварэння тэксту, роля асобы пісьменніка, грошы як матыў для літаратараў, мяжа паміж літаратарам і пісьменнікам, патрыятызм. Кожная з частак – гэта ступень-выпрабаванне на шляху ад чалавека, які захацеў стаць пісьменнікам, да сапраўднага пісьменніка. З кожным новым пад’ёмам на прафесійную (калі можна так сказаць) лесвіцу эсэіст задае адно і тое ж пытанне: ці ёсць яшчэ жаданне стаць пісьменнікам?

У эсэ як жанры не існуе скразнога апавядальнага сюжэту. А. Андрэеў выкарыстоўвае нестандартны для эсэ прыём: яму ўдаецца весці чытача ад пачатку тэкста да канца па сваіх філасофска-літаратурных прасторах. Калі чытач згодны на выказаныя ўмовы, тады можна ісці далей. Напрыклад: “Вы всё ещё хотите стать писателем? В таком случае следует осознать масштаб вы-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

зова этого уникального призвания – быть писателем. Не страшно?” [1, с. 171] або: “Вы всё ещё хотите стать писателем? Тогда добро пожаловать в мир, где пишут, как живут, и живут, как пишут. Здесь цена и мера всех вещей – личность” [1, с. 172]. Такім чынам аўтар апраўдвае словы крытыкаў і тэарэтыкаў літаратуры, якія прымяняюць у адносінах да эсэ назву “звышжанр”.

Стварэнне нарацыі шляхам разважанняў сцвярджае судакрананне эсэ з эпасам. Паміж аўтарам і чытачом эсэ заўсёды адбываецца ўмоўны дыялог, што дазваляе суадносіць эсэ з драмай. Але першасна эсэ ўспрымаецца як свабоднае выражэнне думак аўтара, і гэта дае права лічыць эсэ роднасным паэзіі. Твор А. Андрэева “Вы ўсё ж такі хаце лі б стаць пісьменнікам?” найлепшым чынам дэманструе месца эсэ ў сістэме жанраў.

Пачатак эсэ “Вы ўсё яшчэ хацелі б стаць пісьменнікам?” прадстаўлены парадаксальнымі развагамі аўтара на тэму вопыту: “А зачем, собственно? Поделиться опытом? Всучить нечто сакральное? Секрет мастерства, например, который тут же научит их «писать»?” [1, с. 167]. Пачатак разлічаны на прыцягненне ўвагі чытача, інтэлектуальнае абурэнне, нязгоду з аўтарам. Эсэіст абвяргае агульнавядомае сцвярджэнне пераемнасці вопыту наступнымі пакаленнямі. У невялікім па аб’ёме тэксце А. Андрэеў клапоціцца пра кожнае слова, ведаючы яму кошт. Эсэ як жанр не дае права аўтару распісваць доўгія разважанні (менавіта такое ўяўленне пра эсэ мае большасць непрафесіяналаў). Будучы тэарэтыкам літаратуры і вопытным аўтарам, А. Андрэеў адначасова прафесійна і таленавіта валодае ўнутранымі тэкставымі стратэгіямі і мастацкімі прыёмамі. Аўтар “тонка адчувае дыскурс самаго жанру эсэ і маніпулюе свядомасцю чытача, выкарыстоўваючы вядомую хітрасць – прыцягнуць яго ўвагу нечаканым парадаксальным вывадам, г. зн. бездакорна валодае стратэгіяй інфармацыйнай агрэсіі і паспяхова выкарыстоўвае яе” [5, с. 408].

Вялікі аратар старажытнасці Цыцэрон трыумфам красамоўства лічыў ампліфікацыю. Лагічна, што менавіта гэтую стылістычную фігуру А. Андрэеў выкарыстоўвае ў доказнай сістэме свайго эсэ. Ампліфікацыя рэзка павышае ступень успрымання тэксту чытачом: “Оказывается, можно технично обозначить завязку, можно технично подвести к «ударной концовке»; можно овладеть портретной техникой персонажа; можно научиться технике диалога; можно повысить «культуру работы с деталью»; можно научиться приемам, с помощью которых выразительно описывать тишину, ночь, одиночество, любовь, даже смерть. Почему нет? Можно научиться технике уклоняться от таких пугающих читателя категорий, как истина, личность, мышление и прочей никому не интересной зауми. Можно писать одними глаголами, можно избавиться от эпитетов…” [1, с. 168]. Эсэіст нібы праграміруе, замбіруе чытача, даказваючы сваю праўду з дапамогай шматлікіх паўтораў слова “можна”.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Доказную сістэму тэкста ўзмацняе паслядоўнае падпарадкаванне, пры якім аўтар спачатку выказвае парадаксальную думку, а потым адразу ж яе даказвае. Такі прынцып тэкстабудавання пацвярджае тэзіс аб тым, што эсэ – гэта перш за ўсё "інтэлектуальная правакацыя" [3, с. 25].

Яшчэ адзін істотны прыём – пытальна-адказавая форма. Прачытаўшы пытанне, наўрад ці чытач стрымаецца, как не прачытаць яшчэ і кароценькі адказ на яго, які, у сваю чаргу, нараджае другое пытанне і чарговы адказ. Гэтак працягваецца доўга, такім чынам хутка і незаўважна для чытача арганізоўваецца доказная сістэма эсэ.

У эсэ "Вы ўсё ж такі хацелі б стаць пісьменнікам?" адчуваецца акадэмічнасць, аўтара відавочна заманьвае спакуса завершанасці, паўнаты адказу на пастаўленае ім жа пытанне. Названы твор, безумоўна, – узорны прыклад жанру эсэ з характэрнай для яго парадаксальнасцю, доказнасцю, лагічнасцю і суб'ектыўнасцю.

## Літаратура


1. Андреев, А. Вы всё ещё хотите стать писателем? Эссе / Анатолий Андреев // Нёман. – № 4. – 2016. – С. 167–173.
2. Гарадніцкі, Я. Мастацкая рэфлексія беларускай літаратуры як фактар актывізацыі творчых пошукаў / Я. Гарадніцкі // Літаратура пераходнага перыяду : тэарэтычныя асновы гісторыка-літаратурнага працэсу / М. А. Тычына [і інш.] ; навук. рэд. М. А. Тычына. – Мінск : Беларус. Навука, 2007. – С. 101–160.
3. Зацепин, К. Эссе: от философии к литературе / Константин Зацепин // НЛО. – 2010. – № 104. – С. 21–32.
4. Лотман, Ю. Биография – живое лицо / Ю. Лотман // Новый мир, 1985. – № 2. – С. 228–236.
5. Яницкий, М. Жанр эссе полемического характера в публицистическом дискурсе А. Андреева / Михаил Яницкий // Журналістыка – 2015: стан, праблемы і перспектывы : матэрыялы 17-й Міжнар. навук.-практ. канф., 12–13 ліст. 2015 г., Мінск / рэдкал. : С.В. Дубовік (адк. рэд.) [і інш.]. – Вып. 17. – Мінск : БДУ, 2015. – С. 407– 410.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова